*Литература*

1. Лазаревский Н. И. Русское государственное право. СПб., 1913.
2. Ленин В. И. Победа кадетов и задачи рабочей партии // Полн. собр. соч. Т. 12.
3. Юшков С. И. История государства и права СССР. 4-е изд. М., 1961. Ч. 1.
4. Шершеневич Г. Ф. Конституционная монархия. М., 1906.


## НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ Ў МІЖРЭВАЛЮЦЫЙНЫ ПЕРЫЯД (ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ)


*М. М. Забаўскі, г. Мінск*


На нашых вачах адбываюцца шматлікія нацыянальныя сутычкі, якія часта перарастаюць ва ўзброеныя канфлікты. Падобныя праблемы былі характэрны для краіны і ў пачатку XX ст., калі пад уздзеяннем падзей 1905-1907 гг. самаўладдзе пайшло на пэўную трансфармацыю грамадска-палітычнага ладу краіны. Тым не менш, недаацэнка нацыянальнага фактару праяўлялася ў тым, што праблемы, звязаныя з нацыянальным пытаннем, не ставіліся на парадак дня агульных сходаў вышэйшага прадстаўнічага органа – Дзяржаўнай думы. Па гэтай прычыне амаль да апошніх гадоў адсутнічалі спецыяльныя працы, прысвечаныя акрэсленай намі тэме. Аднак асобныя аспекты знайшлі адлюстраванне ў працах гісторыкаў, філосафаў і інш.

На фоне дэбатаў у сценах Думы з'явіліся першыя публікацыі. Прычым іх аўтарам быў і дэпутат ад Віленскай губерні, намеснік пракурора Віленскай судовай палаты, намеснік сакратара Дзяржаўнай думы III склікання Г.Г. Замыслоўскі. Адзін з актыўных лідэраў "Саюза рускага народа" ён прадстаўляў у Думе асобную "рускую" курыю [1]. Ад Віцебскай губерні ў выніку дамоўленасці польскіх землеўласнікаў з "Рускім выбарчым камітэтам" дэпутатам II Дзяржаўнай думы стаў Г. Дымша. Ён быў актыўным удзельнікам Віцебскага губернскага і Рэчыцкага павятовага таварыстваў сельскай гаспадаркі. Прадстаўляў губерню на Маскоўскім з'ездзе земскіх і гарадскіх дзеячаў, які адбыўся ў верасні 1905 г. У Думе з'яўляўся віцэ-прэзідэнтам "Кола польскіх дэпутатаў-канстытуцыяналістаў Літвы і Русі". У 1906 г. Л. Дымша як буйны землеўладальнік выказаў сваё бачанне "польскага пытання" у краі [2].

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі, акрамя некалькіх прапагандысцка-публіцыстычных прац, напрацовак па нацыянальным пытанні практычна не было. Негатыўныя адносіны У. Леніна і партыі бальшавікоў да Думы прывялі да таго, што ў савецкі час даследавалася ў асноўным нацыянальная праграма партыі бальшавікоў.

Між тым, у 20-30-я гады былымі членамі Дзяржаўнай думы і дзяржаўнымі дзеячамі за мяжой былі надрукаваны мемуары [3]. І толькі ў 1976 г. з'явілася манаграфія Т. Бурмістравай і В. Гусаковай, у якой некалькі раздзелаў былі прысвечаны разгляду нацыянальных праблем у дзейнасці I-IV Дзяржаўных дум [4].

З 90-х гг. пачынаецца новы этап у даследаванні нацыянальнага пытання. Выходзяць працы, у якіх прасочваюцца метады і формы вырашэння нацыянальнага пытання [5]. Вялікі ўклад у даследаванне расійскага "парламентарызму" унеслі Я. Чарменскі [6], А. Аўрэх [7], В. Дзякін [8]. Аўтары закраналі нацыянальнае пытанне, якое з'яўлялася адным з галоўных у грамадска-палітычным жыцці імперыі, асабліва па пытаннях аб адлучэнні Холмскага краю ад Царства Польскага і увядзення земскага самакіравання ў губернях Заходняга краю.

У 90-х гг. у сувязі з актывізацыяй палітычнага жыцця, утварэння і выхаду на палітычную арэну шматлікіх партый, пачалося пераасэнсаванне палітычных працэсаў, якія адбываліся ў краіне ў пачатку XX ст., што прывяло да новых публікацый [8]. З'яўляюцца комплексныя гістарычныя працы замежных аўтараў [9] і публіцыстычныя выданні [10].

Некаторыя аспекты думскай барацьбы, адносіны ўрада і да нацыянальнага пытання, закраналіся ў працах М. Дабратвора, Т. Бурмістравай, А. Егіпко, М. Ярошкіна, Л. Спірына, К. Шалагіна, Е. Чарменскага. Дэталёва прасочвае гісторыю заснавання, падрыхтоўкі і работы Дзяржаўнай думы першага парламента Расіі – А. Смірноў [11].

Сярод прац беларускіх гісторыкаў, якія аналізавалі размеркаванне палітычных сіл у Беларусі ў пачатку XX ст. і закраналі думскую праблематыку, неабходна вызначыць навуковыя напрацоўкі К. Шабуні [12] і М. Марцюховай [13]. Апошняя паказала сутнасць і палітычнае аблічча агульнарасійскіх і мясцовых партый і груповак у перыяд І Думы, прааналізавала выступленні дэпутатаў ад Беларусі на фоне думскіх спрэчак.

Адным з самых вострых пытанняў, вакол якога ў Думе, а таксама ў друку разгарнулася барацьба паміж прадстаўнікамі розных палітычных плыняў, былі заходнія земствы. Гэтай праблематыцы прысвяцілі свае працы А. Аўрэх [14], В. Сарокіна [16], В. Слабажанін [16].

Вялікі ўклад у распрацоўку пытанняў, звязаных з выбарамі і функцыяніраваннем І і ІІ Дзяржаўных дум, дзейнасцю дэпутацкага корпуса ад 5 заходніх губерняў, аналізам урадавай палітыкі ў Беларусі, палітычнай сітуацыяй ў трэцячэрвеньскі перыяд, месцам і роллю газеты "Наша ніва", адносінамі да Думы беларускага сялянства, станам нацыянальнага пытання ў заходніх губернях, унёс М.Біч [17]. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый Расіі і Беларусі ў канцы XIX ст. – лютым 1917 г. аналізуе М. Сташкевіч [18].

Гісторыі літоўскіх і беларускіх палякаў, якія на мяжы XIX – XX стст. у "эпоху нацыяналізму" апынуліся ў сітуацыі выбару паміж "згоднікамі", скіраванымі на Расію і "нацыяналістамі" – на Польшчу, прысвечаны навуковыя працы А. Смалянчука. Аўтар абгрунтоўвае канцэпцыю, што з прыярытэту інтарэсаў Беларуска-Літоўскага краю выступалі "краёўцы", якія звязвалі яго будучыню з фарміраваннем грамадзянскай супольнасці – "нацыі ліцвінаў". Грунтоўны аналіз польскага руху на беларускіх і літоўскіх землях дае магчымасць прасачыць узровень свядомасці мясцовай польскай грамадскасці, якая "...шукала



ўласную ідэнтычнасць ва ўмовах актывізацыі польскага нацыянальнага руху і нацыянальна-культурнага Адраджэння беларусаў і літоўцаў" [19].

Палітычныя пазіцыі польска-беларускіх аўтанамістаў у Дзяржаўнай думе (1906 – 1917 гг.) аналізуе ў сваіх працах М. Забаўскі [20]. Аўтар вылучае нацыянальнае пытанне як адно з галоўных у грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў пачатку XX ст. Асабліва яно абвастралася ў перыяд выбарчых кампаній у Думу, а таксама пры разглядзе ў III Дзяржаўнай думе законапраекта аб земствах у заходніх губернях.

Нацыяналнае пытанне з'яўлялася складовай часткай праграм палітычных партый і груп, яно праходзіла як цэнтральнае ў перыядычным друку.

### *Літаратура*


1. Замысловский Г. Г. Польский вопрос в Государственной думе 3-го созыва 1 сессии. Вильна, 1909.
2. Дымша Л. Доклад по польскому вопросу. СПб., 1906.
3. Винавер М. М. Недавнее: воспоминания и характеристики. Париж, 1926; Витте С. Ю. Воспоминания. Берлин, 1924; Милюков П. Н. Россия на переломе. Париж, 1927.
4. Бурмистрова Т. Ю., Гусакова В. С. Национальный вопрос в программах и тактике политических партий в России в 1905—1917 гг. М., 1976.
5. Носов Б. В. Польский вопрос в Государственной думе. 1907—1914 гг. //Нация и национальный вопрос в странах Центральной и Юго-Восточной Европы во второй половине XIX – начале XX в. М., 1991; Раскин Д. «Еврейский вопрос» в документах высших государственных учреждений Российской империи XIX–начала XX в. // История евреев в Россни. СПб., 1993. Вып. 1.
6. Черменский Е. Д. IV Государственная дума и свержение царизма в России. М., 1976.
7. Аврех А. Я. Столыпин и третья Дума. М., 1968; ён жа. Царизм и IV Дума (1912–1914 гг.). М., 1981; *ён жа*. Столыпин, либералы, революция // Государственная деятельность Столыпина. М., 1994; Дякин В. С. Буржуазия, дворянство и царизм в 1911-1914 гг. Л., 1988.
8. Демин В. А. Государственная дума: механизм функционнрования. М., 1996; Ежов М. В. История государственных учреждений. СПб., 1996; Родионов А. И. Российская государственность на переломных этапах XX в. М., 1996.
9. Верт Н. История советского государства. М., 1995; Пайпс Р. Русская революция. М., 1994.
10. Россия XIX—XX вв.: взгляд зарубежных историков. М.: СПб., 1996.
11. Смирнов А. Ф. Государственная дума Российской империи 1906—1917. М., 1998.
12. Шабуня Н. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905 – 1907 гг. Мн., 1962.
13. Мартюхова М. А. На переломе революции: общественно-политическое




1650990

Бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

движение в Белоруссии в связи с учреждением Государственной думы в России (август 1905 – июнь 1906 г.). Мн., 1986.
14. Аврех А. Я. Вопрос о западном земстве и банкротство Столыпина // Исторические записки АН СССР. М., 1961. Т. 70.
15. Сорокина В. В. Политика русского самодержавия в отношении западных земств // Правоведение. 1979. № 1.
16. Слабожанин В. П. Земское самоуправление в Белоруссии (1905 – 1907 гг.). Мн., 1994; *ён жа.* Да гісторыі ўвядзення земства ў Беларусі (1864 – 1911) // Весці АН БССР. 984. № 4.
17. Біч М. В. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1917 г. Мн., 1998.
18. Сташкевіч М. Праграмы палітычных партый Расіі, канец XIX – пачатак XX ст. Мн., 1995; *ён жа.* Палітычныя партыі Беларусі. Мн., 1994.
19. Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. Мн., 2004.
20. Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 – 1917 гг.). Мн., 1999.
21. Забаўскі М. М. Нацыянальнае пытание і палітычныя пазіцыі дэпутатаў ад Беларусі ў III Дзяржаўнай думе Расіі (1907 – 1912 гг.) //Весці БДПУ. 1998. № 2.
22. Забавский Н. М. Национальный вопрос в общественно-политическом движении в Белоруссии в период III Государственной думы (1907 – 1912 гг.). Мн., 1998.

## ИСТОРИОГРАФИЯ ПЕРВЫХ СОВЕТОВ В РЕВОЛЮЦИИ 1905 г. В ТРУДАХ АКАДЕМИКА И. О. ГОРИИА

*П. Т. Петриков, г. Минск*

После захвата большевиками вооружеиным путем власти в России в октябре 1917 г. (в феврале 1917 г. буржуазия также вооруженной силой свергла власть царского самодержавия), зациты власти Советов в гражданской войне в жизни Советской России, затем Советского Союза начался новый период – период социалистического развития. На новые «рельсы» переходила и историческая наука. Уже в середине 1920-х годов она прочно встала на позиции диалектико-материалистического понимания закономерностей развития общества, стала заметным явлением на международных форумах историков. Так. на международной «Неделе» историков в 1928 г. в Берлине советская делегация представила на выставке в Прусской библиотеке 625 наименований работ по революционному и рабочему движению, 91 – по истории революции 1905 г., 174 – Октябрьской революции и гражданской войне, более 100 – по истории РСДРП(б) и РКП. Эти цифры свидетельствовали о приоритетах и масштабах нарождавшейся советской исторической науки. В ее основу закладывались труды Маркса, Энгельса, Плеханова, Ленина. Признанным авторитетом тогда был российский